УДК 947.6

А.В. Ефімовіч

# Гістарыяграфія рэформы М.М. Мураўёва ў дзяржаўнай вёсцы Беларусі ў 1857–1862 гг.

Навука, якая займалася вывучэннем адметных рыс беларусаў у мінулым і сучасным, атрымала назву беларусазнаўства. Аднак, у пачатковы перыяд беларусазнаўства русіфікатарская палітыка царызму затармазіла развіццё гэтай навукі. Адным з першых выданняў стала даследаванне П.В. Баброўскага, дзе прыводзіліся матэрыялы па геаграфіі і статыстыцы Расіі, сабраныя афіцэрамі генеральнага штаба па Гродзенскай губерні, якое выйшла ў свет у Санкт-

Пецярбургу ў 1863 г. [1]. Менавіта ў гэтым даследаванні ў другой частцы можна ўзяць некаторыя статыстычныя дадзеныя па плацяжах, колькасці надзелаў, якасці апошніх і побыце дзяржаўных сялян у Гродзенскай губерні. Таксама П.В. Баброўскі ў сваім даследаванні робіць першую спробу паказаць становічыя і адмоўныя бакі жыцця дзяржаўных сялян згаданай губерні на момант, калі міністрам дзяржаўных маёмасцей стаў М.М. Мураўёў.

Ужо праз год у Санкт-Пецярбургу выходзіць аналагічнае выданне па Мінскай губерні І. Зяленскага. Тут даюцца некаторыя дадзеныя аб колькасці казённых сялян у гэтай губерні, прыводзяцца лічбы аб колькасці зямлі ў згаданай катэгорыі сялян, даецца ацэнка прапарцыянальных і працэнтных адносін зямельных надзелаў у дзяржаўных сялян і арандатараў з вышэйшых саслоўяў. У дадзеным выданні прыводзяцца параўнальныя звесткі па першай і паверачнай люстрацыі. Адметнай асаблівасцю Мінскай губерні таксама з'яўлялася тое, што толькі ў ёй пад час адміністрацыйнай рэформы было ліквідавана акруговае кіраванне – звесткі па гэтым пытанні таксама можна знайсці ў даследаванні І. Зяленскага [2].

На працягу 1882–1884 гадоў з друку выйшла тры кнігі А. Дзембавецкага па вопыце апісання Магілёўскай губерні, у якой даваўся падрабязны аналіз азначанага рэгіёна [3].

Нарэшце, у 1890 г. у свет выйшла гісторыка-геаграфічнае і статыстычнае апісанне Віцебскай губерні [4].

Менавіта з выданняў вышэйпералічаных апісанняў чатырох беларускіх губерняў можна ўзяць асноўныя і ключавыя дадзеныя па тэме.

У 1888 г. пад эгідай Міністэрства дзяржаўных маёмасцей выйшла кніга, у якой даваўся гістарычны агляд пяцідзесяцігадовай дзейнасці міністэрства дзяржаўных маёмасцей за 1837–1887 гг. [5]. У дадзеным выданні прыводзіцца значны фактычны матэрыял, аналізуюцца падзеі і робяцца вывады. Важным з'яўляюцца ў гэтым накірунку і тыя моманты, што, па-першае, тут прыводзяцца дадзеныя па трох рэформах дзяржаўных маёмасцей (рэформа П.Дз. Кісялёва 30–50-х гг. XIX ст., рэформа М.М. Мураўёва 1857–1862 гг. і рэформа 1864–1867 гг.), што дае магчымасць параўноўваць гэтыя падзеі. Па-другое, пасля рэформы М.М. Мураўёва ўжо прайшоў некаторы час, па ёй зроблены самім міністэрствам вывады – гэта дазваляе параўнаць вывады, зробленыя цяпер, з тымі, якія былі дадзены яшчэ пад час станаўлення капіталістычнага грамадства ў Расіі.

Усе вышэйпералічаныя даследаванні лепш аднесці да гістарыяграфіі, таму што ў іх робіцца першая спроба аўтараў не толькі сабраць і пералічыць згаданыя падзеі, але і зрабіць пэўныя высновы.

У 1915 г. у г. Сергіеў-Пасад выходзіць манаграфія Ю.В. Гацье аб землеўладанні ў Расіі [6]. У гэтым выданні даецца гістарычны агляд дадзенага пытання, складзены аўтарам на аснове лекцый, якія ён чытаў на працягу некалькіх год у Канстанцінопальскім Межавым Інстытуце. Азначанай праблеме прысвечаны § 58 главы IX, дзе расказваецца аб уладкаванні дзяржаўных сялян у XIX ст. Значнае месца ў гэтым параграфе адводзіцца і рэформе М.М. Мураўёва.

Немагчыма даследаванне любой рэформы без добрага ведання біяграфіі яе асноўнага дзеяча. Так, у 1896 г. у Расіі быў створаны Камітэт па збудаванні помніка графу М.М. Мураўёву, які даручыў Ар. Турцэвічу напісаць біяграфію гэтага дзеяча, што выйшла з друку ў 1898 г. [7].

Таксама важным пытаннем з'яўляецца рэакцыя дзяржаўных сялян на праведзеную ў 1857–1862 гг. рэформу, а таксама ўдзел дадзенай катэгорыі сялян у паўстанні 1863 г. Тут з'яўляецца неабходнасць звярнуцца і да матэрыялаў, прысвечаных гэтым падзеям. Самай цікавай з'яўляецца кніга Васіля Ратча аб

так званым польскім бунце 1863 г. у «Паўночна-Заходнім краі Расіі», якая выйшла ў 1867 г. [8].

Новы этап беларускай гістарыяграфіі пачаўся пасля 1917 г. Даследчыкі скіравалі ўласныя намаганні на тыя праблемы, якія да рэвалюцыі займалі нязначнае месца ў вывучэнні. Гэта, у прыватнасці, былі такія тэмы, як развіццё гаспадаркі і сялянскае пытанне, асабліва ў кантэксце класавай барацьбы.

Паслярэвалюцыйная гістарыяграфія ў сваім развіцці прайшла некалькі этапаў станаўлення. Так, у 20-я гг. ХХ ст. назіраецца павелічэнне колькасці навуковых даследаванняў, прысвечаных гісторыі Беларусі. Цэнтральнае пытанне, якое ўздымаюць гэтыя працы – развіццё сельскай гаспадаркі ў ХІХ ст. (перыяд пераходу да капіталістычных адносін), развіццё прамысловасці на мяжы ХІХ і ХХ ст., а таксама класавая барацьба. Паказваць палітыку царскага ўрада як рэфарматарскую для навукоўцаў таго часу было немэтазгодна. Менавіта таму, акрамя рэформы 1861 г. па адмене прыгоннага права, даследчыкі не звярнулі ўвагі на рэформы ў дзяржаўнай вёсцы Беларусі, якія там праводзіліся.

У канцы 20-х – 30-я гг. праводзілася палітыка барацьбы з нацдэмаўшчынай, што не магло не адбіцца і на развіцці гістарычнай навукі. У 1934 г. у БДУ адкрыты гістарычны факультэт, аднак на ім нават адсутнічала кафедра гісторыі Беларусі. Айчынная гісторыя вывучалася ў курсе гісторыі СССР. Менавіта таму навуковыя працы таго часу ў большасці сваёй былі прысвечаны агульнарасійскім падзеям. Рэформы, якія праводзіліся ў іншых рэспубліках асобна, не былі актуальнымі.

У пасляваенны час цікавасць навукоўцаў да ХІХ стагоддзя падае. Самай папулярнай была ваенная тэматыка. Аднак, менавіта ў 1946 г. выйшаў першы том кнігі акадэміка М.М. Дружыніна «Государственные крестьяне и реформа П.Д. Киселёва», у якой характарызуюцца перадумовы і сутнасць рэформы [9]. Гэта была першая грунтоўная спроба разгледзець становішча дзяржаўных сялян Расіі ў ХІХ ст.

У канцы 50-х – 60-я гг. пытанні сельскай гаспадаркі ХІХ ст. зноў становяцца актуальнымі. Так, у 1965 г. выходзіць манаграфія гісторыка М.М. Улашчыка, прысвечаная перадумовам сялянскай рэформы ў 1861 г. у Літве і Заходняй Беларусі [10]. А раней у 1958 г. выходзіць другі том кнігі М.М. Дружыніна «Государственные крестьяне и реформа П.Д. Киселёва», у якой распавядаецца аб рэалізацыі і наступствах рэформы [11]. У гэтай кнізе згадваецца і рэформа М.М. Мураўёва.

У 1960 г. з'явіўся артыкул Т.А. Конюхавай пра становішча дзяржаўных сялян Літвы. Гэта быў толькі пачатак работы над апісаннем рэформы П.Дз. Кісялёва ў рэгіёнах, дзе яна была праведзена. А ўжо ў 1975 г. у Маскве выйшла яе манаграфія, прысвечаная дзяржаўнай вёсцы Літвы і рэформе П.Дз. Кісялёва ў 1840–1857 гг. у Віленскай і Ковенскай губернях [12].

У 1966 г. у г. Мінску выйшла манаграфія В.У. Чапко, прысвечаная сельскай гаспадарцы Беларусі ў першай палове ХІХ ст. [13]. У гэтым выданні ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі згадваліся, як асобная катэгорыя, дзяржаўныя сяляне. У 1980 г. выйшла кніга С.М. Самбук аб палітыцы царызму на Беларусі ў другой палове ХІХ ст., у якой таксама згадваліся дзяржаўныя сяляне і рэформы ў дзяржаўнай вёсцы ў ХІХ ст. [14]. Наступным момантам вывучэння становішча дзяржаўных сялян на Беларусі стала тое, што ў 1986 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце В.Э. Загарульская абараніла дысертацыю па тэме «Реформа государственной деревни Беларуси (30–50-е гг. ХІХ в.)» [15].

Аднак, нягледзячы на з'яўленне значнай колькасці работ, яшчэ заставалася шмат пытанняў, амаль незакранутых даследчыкамі. Сярод гэтых пытанняў заставалася і рэформа М.М. Мураўёва.

Першай спробай грунтоўна даследаваць рэформу ў дзяржаўных маёмасцях 1857–1862 гг. з'явіўся артыкул В.І. Неўпакоева пра рэформу М.М. Мураўёва, які выйшаў у зборніку «Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг.» у 1970 г. [16]. Аднак, яшчэ ў 1972 г. у г. Вільнюсе Л.М. Бычкаускасам-Гентвілам была абаронена доктарская дысертацыя па тэме «Аграрный вопрос в Литве и Западной Белоруссии (1861–1905 гг.)», дзе дадзены кароткія звесткі і па «контрэформе», згадваецца там і матэрыял па беларускіх губернях.

Пасля выхаду манаграфіі В.І. Неўпакоева рэформа М.М. Мураўёва была забыта амаль на два дзесяцігоддзі. У 90-я гг. мінулага стагоддзя адначасова два беларускія гісторыкі ў сваіх артыкулах згадалі вышэйназваную рэформу.

Так, у 1996 г. у «Беларускім гістарычным часопісе» выйшаў артыкул беларускага гісторыка В. Панюціча аб рэформах дзяржаўных сялян Беларусі ў канцы 50-х – 70-я гг. XIX ст. [17]. У гэтым артыкуле прыводзяцца і некаторыя параўнанні аграрных мерапрыемстваў у азначаны перыяд з выкарыстаннем лічбаў і архіўных матэрыялаў. У тым жа годзе ў «Весніку Беларускага дзяржаўнага універсітэта» выйшаў артыкул У.А. Сосны, які ўпершыню ўвёў у навуковую літаратуру паняцце аб рэформе М.М. Мураўёва 1857–1862 гг. [18].

Важнае месца пры даследаванні рэформы М.М. Мураўёва 1857–1862 гг. у дзяржаўнай вёсцы Беларусі займаюць біяграфічныя дадзеныя асноўных яе асоб. Непасрэдным удзельнікам і ініцыятарам рэформы быў міністр дзяржаўных маёмасцей М.М. Мураўёў. Аднак грунтоўных даследаванняў па яго дзейнасці на гэтай пасадзе ў XX ст. не было.

Яшчэ адной важнай асобай, якае мае дачыненне да рэформы 1857–1862 гг., з'яўляецца П.А. Валуеў. Пад час рэформы ён спачатку ў 1858 г. быў назначаны дырэктарам II Дэпартамента Міністэрства дзяржаўных маёмасцей, а ў 1859 г. яшчэ ўзначаліў і III Дэпартамент гэтага міністэрства, якое пазней было перайменавана ў Дэпартамент сельскай гаспадаркі. Яго біяграфію апісаў П.А. Зайанчкоўскі ва ўводзінах да дзённіка П.А. Валуева, які выйшаў у 1961 г. [19].

Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі па праблеме рэформы М.М. Мураўёва ў дзяржаўнай вёсцы Беларусі ў 1857–1862 гг. паказвае, што аказаліся акрэслены толькі асноўныя контуры гэтай праблемы. Нават у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і ў трохтомным выданні па гісторыі сялянства Беларусі тэма дадзенай рэформы толькі згадваецца ў агульных рысах, аднак застаецца не вывучанай. Усё вышэйсказанае дазваляе гаварыць аб наяўнасці, з аднаго боку, істотных «прабелаў» у вывучэнні дадзенай тэмы, а з другога – аб рэальных магчымасцях да іх ліквідацыі.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба***. Гродненская губерния: в 2 ч. / сост. П. Бобровский. – СПб., 1863. – Ч. 2. – 1098 с.
2. ***Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба***. Минская губерния: в 2 ч. / сост. И. Зеленский. – СПб., 1864. – Ч. 2. – 696 с.
3. ***Опыт описания Могилевской губернии***: в 3 т. / сост. А.С. Дембовецкий. – Могилев, 1882–1884. – Т. 1–3.
4. ***Витебская губерния: историко-географический и статистический обзор*** / сост. по программе и под ред. Витебского губернатора. – Витебск, 1890. – 402 с.
5. ***Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности министерства государственных имуществ 1837–1887***: в 2 ч. – СПб., 1888. – Ч. 2. – 562 с.
6. ***Готье, Ю.В.*** Очерки истории землевладения в России / Ю.В. Готье. – Сергиев Посад, 1915. – 208 с.

7. ***Турцевич, Ар.*** Краткий очерк жизни и деятельности Графа М.Н. Муравьева / Ар. Турцевич. – Вильна, 1898. – 64 с.
8. ***Ратч, В.*** Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России / В. Ратч. – Вильна, 1867. – 678 с.
9. ***Дружинин, Н.М.*** Государственные крестьяне и реформа П.Д. Киселева / Н.М. Дружинин. – М.–Л., 1946. – Т. 1. – 636 с.
10. ***Улащик, Н.Н.*** Предпосылки крестьянской реформы в 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н.Н. Улащик. – М., 1965. – 479 с.
11. ***Дружинин, Н.М.*** Государственные крестьяне и реформа П.Д. Киселева / Н.М. Дружинин. – М., 1958. – Т. 2. – 620 с.
12. ***Конюхова, Т.А.*** Государственная деревня Литвы и реформа П.Д. Киселева 1840–1857 гг. (Виленская и Ковенская губернии) / Т.А. Конюхова. – М., 1975. – 252 с.
13. ***Чепко, В.В.*** Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В.В. Чепко. – Мн., 1966. – 220 с.
14. ***Самбук, С.М.*** Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С.М. Самбук. – Мн., 1980. – 224 с.
15. ***Загорульская, О.Э.*** Реформа государственной деревни Белоруссии (30–50-е гг. XIX в.): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / О.Э. Загорульская. – Минск, 1986. – 236 с.
16. ***Неупокоев, В.И.*** Контрреформа в государственной деревне Литвы (1857–1862 гг.) / В.И. Неупокоев // Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг. – М., 1970. – С. 23–56.
17. ***Панюціч, В.*** Рэформы дзяржаўных сялян Беларусі (канец 50-х – 70-я гг. XIX ст.). / В. Панюціч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – № 3. – С. 23–32.
18. ***Сосна, У.А.*** Эвалюцыя дзяржаўных сялян на Беларусі ў другой трэці XIX ст. / У.А. Сосна // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. – 1996. – № 1. – С. 13–17.
19. ***Дневник П.А. Валуева, министра внутренних дел:*** в 2 т. / Академия наук СССР; ред. П.А. Зайончковский. – М., 1961. – Т. 1. – 1964. – 422 с.



*S U M M A R Y*

*A brief survey of the literature on the problem studied in our research is given in the article. At the same time the periods of the development of the historiography in Belarus are characterized.*



*Поступила в редакцию 28.06.2004*